ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (1183) ● 1 снежня 1977 г. Цана 2 кап.

БІБЛІЯТЭКА: ПРАБЛЕМЫ І ЗАДАЧЫ

Якаснае абслугоўванне студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу магчыма толькі на аснове добра скамплектаваных, навукова-абгрунтаваных фондаў. За апошняе дзесяцігоддзе фонды бібліятэкі амаль падвоіліся і складаюць 1 млн. 400 тыс. экз. Трэцюю іх частку складае вучэбная літаратура. Гэта ў асноўным кніжныя зборы, якія непасрэдна выкарыстоўваюцца для забеспячэння вучэбнага працэсу.

Вядома, што лекцыі не могуць даць усяго комплексу ведаў, якімі павінен авалодаць студэнт. Усё большае значэнне набывае самастойная работа з кнігай. Акцэнт на самастойную работу студэнтаў, рэзкае павелічэнне колькасці выданняў, якія патрабуюцца для вучэбнага працэсу і якія нельга сканцэнтраваць у асабістых бібліятэках, — усё гэта аказвае ўплыў на выкарыстанне бібліятэчных фондаў.

Даныя праведзеных намі даследаванняў паказваюць, што толькі 4,7 працэнта студэнтаў маюць у асабістых бібліятэках неабходную для вучэбнай работы літаратуру. Пераважная большасць студэнтаў (93,5 працэнта) атрымліваюць яе ў бібліятэцы універсітэта. Аднак 16,5 працэнта студэнтаў, прычым часцей за ўсё старшакурснікі, вымушаны яшчэ звяртацца за літаратурай у іншыя бібліятэкі. Гэта выклікана тым, што па спецкурсах студэнтамі выкарыстоўваецца пераважна навуковая літаратура. Мець усе падручнікі па спецкурсах практычна немагчыма, бо яны вельмі хутка старэюць і выпускаюцца малымі тыражамі.

За апошнія гады ў саставе фондаў бібліятэкі адбыліся сур'ёзныя змены. Узрасла доля спецыяльнай, даведачнай і нават вытворчай літаратуры. Аналіз камплектавання бібліятэкі па асноўных дысцыплінах вучэбных планаў паказвае, што больш як 60 працэнтаў набываемай літаратуры складаюць навуковыя манаграфіі і мастацкія творы, 3 працэнты — даведачная, 37 працэнтаў — вучэбная. Вучэбныя фонды растуць хутка, таму што многія кафедры прапаноўваюць вычарпальнае іх камплектаванне. Такім чынам у фондах павялічваецца колькасць выданняў, попыт на якія невялікі. Гэта выклікана зменамі ў вучэбных планах, адсутнасцю стабільных дапаможнікаў па некаторых курсах, увядзеннем новых дысцыплін, павышанымі патрабаваннямі да вучэбных дапаможнікаў. Для рэгламентавання гэтай работы намі распрацавана інструктыўна-метадычнае пісьмо, у якім выкладзены асноўныя патрабаванні да заказаў вучэбнай літаратуры.

У сувязі з хуткім ростам кніжнага фонду перад бібліятэкай з асаблівай вастрынёй паўстала праблема пераадолення супярэчнасцей паміж імкненнем да паўнаты набыцця ўсёй значымай па данаму профілю літаратуры і абмежаванасцю працоўных рэсурсаў, асігнаванняў і плошчаў захавання. Фонд універсітэцкай бібліятэкі амаль паўтара мільёна, а плошчы разлічаны на 500 тыс. адзінак захавання. Абмежаванасць плошчаў перашкаджае поўнаму выкарыстанню фондаў, павялічвае колькасць адмаўленняў. Каб пазбегнуць гэтага, неабходна своечасова пазбаўляцца ад устарэлай дублетнай літаратуры. Толькі тады мы зможам атрымаць фонд першакрыніц, які з большай эфектыўнасцю можа быць выкарыстан у інфармацыйна-педагагічнай і выхаваўчай рабоце.

Бібліятэка штогод спісвае каля 10 тыс. кніг, аднак большасць іх спісваецца па старасці. У той жа час кафедрамі ў гэтым годзе было адзначана, што больш 6 тыс. тамоў літаратуры не выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе. Кафедры павінны вынесці рашэнне аб спісанні гэтых дапаможнікаў. Але да гэтай пары такога рашэння няма. Бібліятэка не можа гарантаваць выкананне дадатковых заказаў, якія паступаюць ад кафедр пасля выхаду з друку той ці іншай кнігі. Мы правялі вялікую падрыхтоўчую работу: склалі картатэку забяспечанасці, запрасілі спісы рэкамендуемай літаратуры па дысцыплінах для фарміравання камплектаў дапаможнікаў для групавога абслугоўвання. Кафедрам застаецца выдзеліць адказных за забеспячэнне вучэбнага працэсу літаратурай, якія б своечасова праглядвалі картатэку забяспечанасці і ўносілі ў яе адпаведныя змены. У гэтым годзе спісы мы атрымалі толькі ад 20 кафедр, больш поўна рэкамендавалі літаратуру ФПМ, мехмат, хімфак, некаторыя кафедры біялагічнага факультэта.

Бібліятэка ў цяперашні час праводзіць даследаванне «Дынаміка фарміравання і выкарыстання фондаў». Найбольш кваліфікаваныя спецыялісты дэталёва правяраюць выкарыстанне кожнай назвы. Гэты аналіз дазволіць нам атрымаць дакладныя звесткі аб эфектыўнасці камплектавання навуковай літаратуры за даследуемы перыяд. Гэта работа павінна быць закончана ў 1980 годзе.

Вельмі цесна да пытання кнігазабеспячэння прымыкае пытанне групавога абслугоўвання студэнтаў камплектамі дапаможнікаў на семестр ці на навучальны год. У гэтым навучальным годзе мы абслужылі студэнтаў усіх факультэтаў з першага па чацвёрты курс за 6 дзён. Бібліятэка распрацавала дакладную методыку абслугоўвання, склала графікі атрымання літаратуры для кожнай групы. Вялікую дапамогу нам аказалі старасты факультэтаў і груп.

На савеце дырэкцыі бібліятэкі мы правялі дакладны разбор метаду групавога абслугоўвання, і ўсе прыйшлі да вываду, што ён вельмі эфектыўны, дае магчымасць бібліятэцы рацыянальна выкарыстоўваць супрацоўнікаў, а студэнтам эканоміць час.

І. АРЭХОЎСКАЯ,
дырэктар бібліятэкі БДУ.

НЕ ЗГАСНЕ СЛАВА

...Яшчэ ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны вораг прызнаваў: «Хаця мы і перавышаем сіламі, але не можам процістаяць масіраванай і дакладнай савецкай артылерыі».

Шмат неўміручых старонак упісана савецкімі артылерыстамі ў летапіс гераічнай барацьбы нашага народа супраць фашызму.

Днямі студэнты універсітэта прымалі ганаровага госця — генерал-лейтэнанта Героя Савецкага Саюза Іосіфа Сямёнавіча Жыгарава. Ад начальніка штаба палка — да камандзіра гвардзейскай асобнай артылерыскай брыгады — такі шлях прайшоў Жыгараў у ваенныя гады. Ён удзельнічаў у вызваленні Беларусі.

...Супраць яго палка немцы кінулі ўзброеную да зубоў пяхотную дывізію. З паветра ворага падтрымлівала каля 107 самалётаў, на зямлі — 75 танкаў. 12 дзён кіпелі баі, і ўрэшце наступленне праціўніка было зломлена. 40 падбітых танкаў і 64 бронетранспарцёры пакінулі немцы на полі бою.

...У прыціхшай зале гучыць расказ удзельніка вайны. Дапытліва сочаць вочы юнакоў і дзяўчат за гэтым чалавекам, студэнты слухаюць легенду мужнасці.

...Старшаму лейтэнанту Лешчанку было нямногім больш за дваццаць. Толькі-толькі закончыў ваеннае вучылішча, прыбыў у полк. Свой подзвіг здзейсніў пры вызваленні Беларусі, на Нясвіжскіх рубяжах. Будучы параненым, Лешчанка адзін вёў трапны артылерыйскі агонь па ворагу, прывёў у паніку амаль цэлую дывізію немцаў і падбіў 7 танкаў...

Бараніць Айчыну ад гітлераўскага нашэсця ў адзін строй сталі людзі розных нацыянальнасцей. Боль за Радзіму, жаданне адпомсціць за яе пакуты з'яднала краснаярскага студэнта Бялова і «вольнага» цыгана Цыганова. У час вайны Цыганоў і Бялоў захапілі ў палон 47 немцаў. 27 з іх былі камандзірамі батарэй.

Ніну Аўсюкову і Аню Бялову ведалі як дзяўчат-добраахвотніц. Ды і ці адны яны такія ў палку, каму выпала трымаць зброю поплеч з дарослымі!

Шчуплыя, маленькія дзяўчаты нагадвалі падлеткаў. Неаднойчы даводзілася ім прасіць строгага маёра, каб пакінуў на фронце.

У голасе апаленага вайной ветэрана нечаканае хваляванне. Мінулае вынесла на ўспамін незабыўны эпізод.

...Ржэў. Немцы метка абстрэльвалі нашы рубяжы, старанна замаскіраваўшы дальнабойную гармату «Берта». Спроба ўстанавіць каардынаты варожай гарматы скончылася няўдачай. Загінула разведка. Не вярнуліся лепшыя радысты. На сувязь з палком выйшаў сам камандуючы фронтам:

— Неабходна прымусіць любой ценой змоўкнуць варожую гармату. Даю вам дзень.

— Зразумела. Ёсць.

І зноў павісла пытанне «Як?».

...Аня Бялова ведала аб тым, што сяброўка Ніна займалася ў школьным гуртку радыстаў. Дзяўчаты прапанавалі сваю дапамогу. Маёру Жыгараву нічога не заставалася, як згадзіцца. Не прайшло і паўгадзіны, як Ніна паведаміла неабходныя каардынаты. Варожая гармата была знішчана за лічаныя хвіліны...

За кожным эпізодам — подзвіг, а за подзвігам — людзі, простыя, сціплыя, любіўшыя жыццё і аддаўшыя яго ў імя сённяшняга дня.

Студэнты з павагай слухалі генерала. У знак сардэчнай удзячнасці і павагі паднеслі госцю памятны падарунак.

М. КУРГАНСКІ.







ПРЫРОДА РАСКРЫВАЕ ТАЯМНІЦЫ

Цікава і захапляюча праходзяць лабараторныя заняткі па марфалогіі раслін у студэнтаў I курса біялагічнага факультэта аддзялення генетыкі. Разам з дацэнтам кафедры Тамарай Аляксандраўнай Сауткінай рабяты вывучаюць асаблівасці будовы раслін, разнастайнасць іх органаў, асаблівасці размнажэння, будову кветкі і многае іншае.

В. ДРАЧОЎ.

На здымках: адказвае В. **Вярцінская;** студэнткі Л. **Ярмолава** і **Т. Лапушкіна** ў час лабараторных заняткаў; старанна вывучаюць будову кветкі студэнткі **Г. Мілейка** і **А. Макрыцкая.**

Фотарэпартаж **аўтара.**

ПРАВІЛЬНАЕ ПЛАНАВАННЕ — ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

У РАБОЦЕ груп народнага кантролю, факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў універсітэта наступае важны момант: падвядзенне вынікаў работы за 1977 год і складанне перспектыўнага плана дзейнасці груп на чарговы, 1978 год.

На пасяджэннях груп неабходна прааналізаваць выкананую за год работу, выявіць недахопы, намеціць шляхі іх ліквідавання, строга спытаць з тых таварышаў, па віне якіх гэтыя недахопы былі дапушчаны. Асаблівую ўвагу належыць звярнуць на павышэнне эфектыўнасці праверак, якія праводзяцца, выкарыстанне ўсіх форм галоснасці ў рабоце народных кантралёраў.

У адпаведнасці з указаннямі партыйных органаў і вышэйстаячых органаў народнага кантролю групы народнага кантролю павінны не менш аднаго разу ў год даваць справаздачу перад калектывамі працоўных аб сваёй рабоце, аб выкананні наказаў справаздачна-выбарных канферэнцый і сходаў. У шэрагу падраздзяленняў такія справаздачы ўжо зроблены. Там, дзе іх яшчэ не было, неабходна правесці справаздачныя сходы, але без перавыбараў груп народнага кантролю» (выпуск № 13) у газеце «Беларускі універсітэт» 21 красавіка 1977 года.

Не трэба ўключаць у планы работы праверку па такіх пытаннях, якія не адносяцца да кампетэнцыі органаў народнага кантролю. Напрыклад, адна з факультэцкіх груп уключыла ў план праверку работы куратараў вучэбных груп. Галаўная група пры азнаямленні з прадстаўленымі групамі планамі работы рэкамендавала выключыць гэтае пытанне, паколькі работай куратараў павінны займацца партыйныя і прафсаюзныя бюро, дэканаты.

Перспектыўны план работы павінен ахопліваць усе сферы дзейнасці групы народнага кантролю. З мэтай ухілення разнабою пры складанні планаў і аблягчэння каардынацыі работы ўсіх груп народнага кантролю, якую здзяйсняе галаўная група, апошняя рэкамендуе пры складанні перспектыўных планаў прытрымлівацца прыкладнай формы плана, разасланага ў свой час камітэтам народнага кантролю Кастрычніцкага раёна, якому мы раней былі падсправаздачныя.

План павінен складацца з наступных раздзелаў: арганізацыйныя пытанні; правядзенне праверак; заняткі народных кантралёраў; контроль за выкананнем рашэнняў.

У першым раздзеле належыць вызначыць парадак дня сходаў групы народнага кантролю і пасяджэнняў яе бюро (калі яно маецца) з указаннем даты і часу правядзення сходаў і пасяджэнняў адказных за падрыхтоўку пытанняў. Рэкамендуецца праводзіць сходы груп ці пасяджэнні бюро груп у пэўныя дні, у адзін і той жа час у адпаведнасці з устаноўленым ва універсітэце графікам правядзення сходаў і пасяджэнняў рэктарата, саветаў універсітэта, факультэтаў і грамадскіх арганізацый. Так, група народнага кантролю БДУ ці яе бюро збіраецца кожны трэці чацвер, у 14.00.

У першым раздзеле плануюцца таксама мерапрыемствы па забеспячэнню галоснасці ў рабоце групы народнага кантролю.

У другім раздзеле пералічваюцца праверкі, якія будуць праведзены на працягу года з указаннем выканаўцаў і тэрмінаў правядзення такіх праверак.

У трэцім раздзеле вызначаецца кола пытанняў, якія будуць абмяркоўвацца на занятках народных кантралёраў, указваюцца час правядзення заняткаў, дакладчыкі.

У апошнім (чацвёртым) раздзеле намячаюцца мерапрыемствы па кантролю за выкананнем рашэнняў і рэкамендацый групы народнага кантролю па пытаннях, якія ўжо абмяркоўваліся, а таксама па выкананню рашэнняў вышэйстаячых органаў народнага кантролю.

Копіі планаў работы павінны быць прадстаўлены ў галаўную групу народнага кантролю ў першай дэкадзе снежня. Гэта дасць магчымасць скаардынаваць работу ўсіх груп народнага кантролю, ліквідаваць дубліраванне, улічыць планы ГНК факультэтаў і іншых падраздзяленняў пры складанні перспектыўнага плана работы галаўной групы.

Штоквартальна павінны складацца квартальныя (рабочыя) планы работы, у якія могуць уносіцца адпаведныя ўдакладненні і дапаўненні ў параўнанні з перспектыўным планам у сувязі з указаннямі вышэйстаячых органаў народнага кантролю і паяўленнем такіх пытанняў, якія раней, пры складанні перспектыўнага плана, не аказаліся ў полі зроку групы.

І. ЦІШКЕВІЧ,
намеснік сакратара парткома па народнаму кантролю, старшыня ГНК БДУ.

ІПК — ВЯЛІКУЮ ЎВАГУ

Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР на інстытуты павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук ускладзены задачы павышэння ідэйна-тэарэтычнага, навукова-метадычнага ўзроўню і педагагічнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу кафедр грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў краіны. Пэўную дапамогу партыйнай арганізацыі і адміністрацыі ў выкананні задач, якія пастаўлены перад інстытутам, аказвае група народнага кантролю ІПК. Група займаецца ў асноўным вучэбна-вытворчымі, навукова-даследчымі і фінансава-гаспадарчымі пытаннямі.

Цяперашні састаў ГНК інстытута пачаў сваю работу з афармлення стэнда, на якім былі вывешаны Палажэнне аб органах народнага кантролю ў СССР, план работы, састаў групы, вынікі праверак і справаздачы аб прынятых па іх мерах.

У план работы групы былі ўключаны праверкі: правільнасці вядзення і захавання вучэбнай дакументацыі на кафедрах; уліку і выдаткавання матэрыяльных каштоўнасцей на кафедрах і на складзе інстытута; гатоўнасці вучэбнага корпуса і інтэрната да новага навучальнага года; стану працоўнай дысцыпліны супрацоўнікаў ІПК.

Праверка правільнасці вядзення і захавання вучэбнай дакументацыі паказала, што на кафедрах няма аднолькавасці ў вядзенні спраў. Групай прапанавана вучэбнай частцы скласці пералік вучэбных спраў, абавязковых для кожнай кафедры.

ГНК аказала дапамогу кафедрам у паляпшэнні захавання матэрыяльных каштоўнасцей. Па прапанове групы для гэтых мэт выдзелены адміністрацыяй асобныя памяшканні. Пры праверцы гатоўнасці інтэрната і вучэбнага корпуса да новага навучальнага года было ўстаноўлена, што адміністратыўна-гаспадарчай часткай была праведзена вялікая работа. Аднак мелі месца і некаторыя недагляды. Група прапанавала ў будучым мець падрабязны пералік прафілактычных работ, якія неабходна ўлічваць пры падрыхтоўцы інтэрната да засялення.

Нядаўна ГНК правяла праверку ўліку і расходавання матэрыяльных каштоўнасцей у інстытуце і прапанавала мерапрыемствы па ліквідаванню некаторых недахопаў.

З вынікамі праверак, прапановамі і рэкамендацыямі азнаёмлены адпаведныя службы і адміністрацыя ІПК, а таксама калектыў інстытута. Акрамя таго, з інфармацыяй аб рабоце ГНК выступіў старшыня групы на партсходзе інстытута.

Работа групы абмяркоўвалася на пасяджэнні партбюро ІПК. Група прымала ўдзел у VI аглядзе сродкаў галоснасці, і па выніках конкурсу ёй прысуджана II месца.

М. Н. АЛЬХОЎКА,
намеснік сакратара партбюро ІПК па народнаму кантролю.

Аб гасдагаворнай рабоце студэнтаў

Аб'ём гасдагаворных работ, якія выконваюцца кафедрамі і лабараторыямі універсітэта, з году ў год узрастае. У 1976 годзе ён перавысіў 4 млн. рублёў. Для выканання такога аб'ёму работ прыцягваюцца ў якасці сумяшчальнікаў выкладчыкі кафедр, штатныя супрацоўнікі і студэнты старэйшых курсаў.

Большасць гасдагаворных работ звязана з рашэннем шэрагу канкрэтных задач, якія маюць непасрэдную сувязь з вытворчасцю. Удзел студэнтаў у выкананні гэтых работ дазваляе ім набыць практычныя навыкі, неабходныя ў далейшай рабоце. Асабліва гэта каштоўна тым, што студэнты працуюць пад кіраўніцтвам тых жа выкладчыкаў, якія чытаюць ім агульныя і спецыяльныя курсы, праводзяць семінарскія заняткі, што дае магчымасць больш цесна спалучаць агульную і спецыяльную падрыхтоўку. У некаторых выпадках па тэме гасдагаворных даследаванняў студэнты выконваюць дыпломныя работы.

Як паказвае аналіз работы шэрагу кафедр радыёфізічнага, хімічнага, біялагічнага факультэтаў, для выканання ўсіх гасдагаворных тэм прыцягваюцца студэнты (у асноўным старэйшых курсаў). На некаторых факультэтах створаны студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Тым не менш у практыцы прыцягнення студэнтаў да выканання гасдагаворных даследаванняў маюцца і недахопы. На большасці кафедр фізічнага, хімічнага, біялагічнага факультэтаў працэнт удзелу студэнтаў у рабоце па гасдагаворнай тэматыцы яшчэ нізкі. Аднак і пры надта вялікай колькасці студэнтаў, калі да выканання аднаго гасдагавору прыцягваецца звыш ста студэнтаў, як на факультэце прыкладной матэматыкі, ускладняецца контроль, зніжаецца эфектыўнасць работы.

Аб'ём гасдагаворных работ пастаянна расце, выкананне шэрагу заказаў настойліва патрабуе, каб кафедры шырэй прыцягвалі студэнтаў да выканання навуковых работ, звязаных з гасдагаворнымі тэмамі.

А. АНДРЭЕЎ,
намеснік старшыні ГНК.

І. А. САКАЛОЎ,
загадчык сектара навуковых работ ГНК.

СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Выпуск № 15

ПАСТАНОВА

ГНК БДУ ПА ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ НАЗНАЧЭННЯ І ВЫПЛАТЫ СТЫПЕНДЫЙ ЗА ЛЕТНЮЮ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНУЮ СЕСІЮ 1976-77 г. СТУДЭНТАМ БІЯЛАГІЧНАГА І ГЕАГРАФІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТАЎ.

Камісія ў саставе членаў групы народнага кантролю БДУ М. В. Кнігі, Р. А. Міхневіч у прысутнасці намесніка дэкана правяла праверку правільнасці назначэння і выплаты стыпендый студэнтам.

У выніку праверкі ўстаноўлена, што стыпендыяльныя камісіі названых факультэтаў пры назначэнні стыпендый кіруюцца палажэннямі «Інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам вышэйшых навучальных устаноў». У састаў стыпендыяльных камісій уваходзяць прадстаўнікі дэканата, партыйнай і прафсаюзнай арганізацый, старасты акадэмічных груп (састаў камісіі зацверджан загадам рэктара ад 11 студзеня 1977 г. за № 10-К). Стыпендыяльны фонд біяфака на II паўгоддзе (ліпень — снежань 1977 г.) складае 104.920 руб., геаграфічнага факультэта — 110.080 рублёў. Фонды выкарыстаны цалкам. Вынікі праверкі зводных ведамасцей паспяховасці і рабочых журналаў зведзены у табліцы.

Аналіз вынікаў паказаў, што на біялагічным факультэце з 443 студэнтаў II — V курсаў 331 (74 працэнты) атрымліваюць стыпендыю. 224 студэнты маюць адзнакі «выдатна» і «добра», што складае 70 працэнтаў агульнай колькасці студэнтаў, якія атрымліваюць стыпендыю, 107 студэнтаў маюць змешаныя адзнакі (30 працэнтаў). Павышаную стыпендыю (на 25 працэнтаў больш) атрымліваюць 32 студэнты, г. зн. 88 працэнтаў агульнай колькасці студэнтаў, якія здалі сесію на «выдатна».

На геаграфічным факультэце 377 з 500 студэнтаў атрымліваюць стыпендыю (75 працэнтаў), з 377 студэнтаў 276 маюць адзнакі «выдатна» і «добра» (73 працэнты) і 101 студэнт мае змешаныя адзнакі (26 працэнтаў). Павышаную стыпендыю (на 25 працэнтаў больш) атрымліваюць 32 студэнты, што складае 100 працэнтаў агульнай колькасці студэнтаў, якія здалі сесію на «выдатна».

Такім чынам, можна адзначыць, што пры назначэнні стыпендый студэнтам на правяраемых факультэтах улічваецца іх выдатная і добрая вучоба, а таксама актыўны ўдзел у грамадскай і навуковай рабоце.

На факультэтах няма ніводнага студэнта, які здаў сесію на «выдатна» і «добра» і не атрымаў стыпендыю.

Імянную стыпендыю імя У. І. Леніна заслужана атрымліваюць на біялагічным факультэце студэнтка IV курса А. Прасвірніна, на геаграфічным факультэце — студэнт V курса М. Струк.

На біялагічным і геаграфічным факультэтах на ўсіх курсах ёсць студэнты, якія атрымліваюць стыпендыю пры наяўнасці ў іх адной здавальняючай адзнакі. Як правіла, стыпендыя такім студэнтам назначаецца па хадайніцтву студэнтаў групы і яе куратара з улікам сямейнага становішча студэнта і актыўнага ўдзелу ў грамадскай рабоце.

Студэнтам, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі ў перыяд экзаменацыйнай сесіі і пераздалі экзамен пасля сесіі, у адпаведнасці з інструкцыяй стыпендыя не назначалася.

Дакументацыя, якая датычыць пытання аб назначэнні стыпендыі, вядзецца правільна.

Пры праверцы правільнасці расходавання фонду матэрыяльнай дапамогі студэнтам устаноўлена, што ўлік яго выкарыстання факультэтамі ў бухгалтэрыі не вядзецца.

ГНК БДУ рэкамендуе:

1. Куратарам, актыву груп і ў далейшым старанна разглядаць усе даныя, якія павінны ўлічвацца пры назначэнні стыпендыі студэнтам.

2. ГНК факультэтаў сістэматычна здзяйсняць контроль за правільнасцю назначэння і выплаты студэнтам стыпендый.

3. Бухгалтэрыі БДУ наладзіць правільны ўлік расходавання матэрыяльнай дапамогі студэнтам.



Ідуць практычныя заняткі на геаграфічным факультэце.
Фота В. ДРАЧОВА.

Да XI Сусветнага фестывалю студэнтаў і моладзі ў Гаване

ДРУЖБА ЗБЛІЖАЕ НАС

У ВНУ Мінска навучаецца 105 пасланцоў Гвінейскай рэспублікі. Прэзідэнт гвінейскага зямляцтва Койта Юнуса — студэнт III курса механіка-матэматычнага факультэта універсітэта. У Мінск ён прыехаў са сталіцы Гвінейскай рэспублікі — горада Канакры. Яго мара — бачыць усе народы Афрыкі свабоднымі і шчаслівымі. У сябе на Радзіме ён быў членам маладзёжнага руху, асноўная мэта якога — барацьба супраць імперыялізму, каланіялізму, расізму і апартэіду. Койта Юнуса працаваў на суботніках, сродкі ад якіх пералічваліся маладзёжным арганізацыям краін Афрыкі, якія вядуць барацьбу за нацыянальнае вызваленне. Прымаў удзел у мітынгах салідарнасці з гэтымі краінамі.

— Гвінейская рэспубліка знаходзіцца далёка ад Савецкага Саюза, але з вашай краінай яе звязваюць адносіны дружбы і супрацоўніцтва. У мяне на радзіме ведаюць, з якой энергіяй СССР змагаецца за мір паміж народамі, супраць нацыянальнага прыгнёту, каланіялізму і расізму. Ведаюць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла прыгнечаным народам шлях да вызвалення. Таму 7 лістапада народ Гвінейскай рэспублікі адзначае як вялікае свята. У дамах Дэмакратычнай партыі Гвінеі, у навучальных установах арганізуюцца выстаўкі, дэманструюцца кінафільмы, расказваючыя аб СССР.

Перад прыездам у СССР я шмат аб ім ведаў. Быў добра знаёмы з творамі Леніна, быў на выстаўках, якія расказвалі аб дзейнасці правадыра рэвалюцыі. Чытаў кнігу «Як гартавалася сталь» Мікалая Астроўскага і апавяданне «Лёс чалавека» Міхаіла Шолахава, бачыў фільм «Вызваленне». У ліцэі, дзе я вучыўся, многія прадметы вялі выкладчыкі з Савецкага Саюза. Аб вашай краіне расказвала мне і мая старэйшая сястра — студэнтка універсітэта Дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы. Таму я з радасцю выкарыстаў магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю ў Савецкім Саюзе.

Усё, што я ўбачыў у вашай краіне — а я пабываў у Маскве, Вільнюсе, Брэсце, Ялце, Сімферопалі, — зрабіла на мяне вялікі ўплыў. Я ўбачыў, чаго дасягнула краіна, у якой гаспадаром з'яўляецца працоўны народ, пераканаўся ў міралюбстве савецкіх людзей, іх імкненні да дружбы і супрацоўніцтва з народамі іншых краін. У Мінску я прымаў удзел у мітынгах салідарнасці з патрыётамі Чылі, мітынгах пратэсту супраць расісцкіх рэжымаў у ЮАР і Радэзіі.

У 1978 годзе Гвінейская рэспубліка адзначыць 20-годдзе вызвалення ад каланіяльнага прыгнёту. І мне асабліва радасна знаходзіцца ў вашай краіне, краіне Вялікага Кастрычніка, які прывёў да незалежнасці і маю радзіму.

Н. МАРАДУДЗІНА,
Л. ПУЛЬЯНАВА.

Мацвей Якаўлевіч Рэзнікаў

(Да 70-годдзя з дня нараджэння)

1 снежня 1977 г. спаўняецца 70 год з дня нараджэння аднаго з выдатных вучоных і педагогаў Белдзяржуніверсітэта, кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта кафедры будовы рэчыва хімічнага факультэта Мацвея Якаўлевіча Рэзнікава.

М. Я. Рэзнікаў нарадзіўся ў Мінску ў сям'і рабочага. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1924 г. рабочым завода і адначасова вучыўся на вячэрнім рабфаку. З 1927 па 1931 г. ён студэнт фізіка - матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, па заканчэнні якога працуе выкладчыкам фізікі ў сярэдняй школе і сельскагаспадарчым тэхнікуме.

З 1933 па 1936 г. М. Я. Рэзнікаў вучыўся ў аспірантуры пры кафедры эксперыментальнай фізікі БДУ і працаваў асістэнтам, затым старшым выкладчыкам. У 1939 г. быў назначан начальнікам спецлабараторыі пры БДУ.

У верасні 1939 г. Мацвей Якаўлевіч удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у гераічнай абароне г. Магілёва. З 1942 па 1944 г.— партызан 3-й Мінскай імя С. М. Будзённага партызанскай брыгады.

У жніўні 1944 г. М. Я. Рэзнікаў вярнуўся ў Белдзяржуніверсітэт, дзе да 1949 г. працуе прарэктарам па завочнаму навучанню, пазней — намеснікам дэкана фізіка - матэматычнага факультэта. З 1955 г. — дацэнт кафедры электрафізікі, у цяперашні час працуе на кафедры будовы рэчыва хімічнага факультэта.

У 1954 г. Мацвей Якаўлевіч паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Ім апублікована каля 60 навукова-папулярных работ па фізіцы дыэлектрыкаў і паўправаднікоў. Усе свае веды і вопыт ён перадае студэнцкай моладзі.

М. Я. Рэзнікаў страсны прапагандыст навуковых ведаў сярод насельніцтва рэспублікі. Вось ужо 18 год ён плённа кіруе таварыствам «Веды» БДУ. Актыўна выступае сярод школьнікаў, настаўнікаў і ў працоўных калектывах г. Мінска. У 1972 г. на Усесаюзным конкурсе на лепшыя творы навукова - папулярнай літаратуры яго работа адзначана дыпломам II ступені.

За баявыя заслугі, навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць М. Я. Рэзнікаў узнагароджан чатырма медалямі Савецкага Саюза, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Усесаюзнага і рэспубліканскага таварыства «Веды».

Прафесарска - выкладчыцкі калектыў, супрацоўнікі, студэнты хімічнага факультэта і ўсяго універсітэта сардэчна віншуюць Мацвея Якаўлевіча Рэзнікава з юбілеем і жадаюць яму доўгіх гадоў творчага і шчаслівага жыцця.

В. ГАМАЎ.

СПРАВА САМІХ СТУДЭНТАЎ

Пайшоў трэці год з таго часу, як быў здадзен у эксплуатацыю інтэрнат № 2 па вуліцы Кастрычніцкай і ў яго пасяліліся студэнты.

Па бытавых умовах інтэрнат лічыцца лепшым ва універсітэце. Працуюць ліфты. Студэнты жывуць у светлых, прасторных пакоях. На кожным паверсе ёсць кухні. Ежу можна гатаваць на газавых плітах. Ёсць толькі адзін недахоп у архітэктуры трынаццаціпавярховага будынка: няма актавай залы, дзе моладзі можна было б праводзіць вечары адпачынку.

Ад жыхароў выбраны галаўны студэнцкі савет. На днях адбыўся справаздачна-выбарны сход. З дакладам аб рабоце студсавета за прашоўшы год выступіў яго старшыня Ігар Тырын. Ён адзначыў, што студсавет аказваў і аказвае дапамогу адміністрацыі інтэрната, камітэту камсамола і прафкому ў арганізацыі выхаваўчай і культурна-масавай работы сярод студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце.

А пачаў студсавет сваю работу з таго, што арганізаваў сацыялістычнае спаборніцтва паміж студэнтамі факультэтаў — жыхарамі інтэрната — па дастойнай сустрэчы 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Юнакі і дзяўчаты афармілі ленінскія пакоі, абнавілі стэнды. Лепшым па выніках конкурсу стаў пакой геаграфічнага факультэта.

Жыллёва-бытавая камісія правяла конкурс на лепшы санітарны стан пакояў. Прызавыя месцы занялі студэнты журфака і хімфака.

У адрозненне ад мінулага года была наладжана дастаўка перыядычнага друку на паверхі.

Перад студэнтамі журфака з цікавымі лекцыямі аб міжнародным становішчы выступіў выкладчык факультэта журналістыкі А. Слука.

Старшыня студсавета звярнуў увагу прысутных на наступны факт. Студсавет журфака правёў вечар, прысвечаны Дню друку, у фае інтэрната. І. Тырын прапанаваў і іншым факультэтам праводзіць культурна-масавыя мерапрыемствы на першым паверсе, у фае, дзе ёсць месца, а не цясніцца ў чытальных залах.

Вясной гэтага года ў інтэрнат прыйшла радасная вестка. Сярод студэнцкіх інтэрнатаў універсітэта інтэрнат № 2 заняў першае месца; на агульнагарадскім конкурсе— другое.

Але разам са станоўчымі вынікамі на сходзе былі выяўлены недахопы. На чарговых пасяджэннях члены студсавета абмеркавалі пытанне аб дрэнным дзяжурстве на паверхах. Адказнаму за дзяжурства А. Чыжу было ўказана.

Выступаючыя ў спрэчках члены студсавета выявілі яшчэ некаторыя недахопы ў рабоце студсавета. У пастанове сходу быў указан тэрмін іх ліквідавання.

Сход прызнаў лепшай работу студсавета біялагічнага факультэта (старшыня А. Пісараў).

У заключэнне сходу быў выбран новы састаў студсавета інтэрната.

У. ДЗЯТЧЫК.

КАБ НЕБА БЫЛО БЛАКІТНЫМ

Твары хлопцаў засяроджаны. Задача для ўсіх ясная, хаця ад гэтага яна не стала лягчэй. Адсюль, з траншэі, вышыня, якую ім неабходна ўзяць, здаецца зусім непрыступнай. Дваццаць пар вачэй напружана абмацваюць яе з усіх бакоў, стараючыся знайсці слабейшае месца. Сонечным шарам вісіць над полем цішыня...

І раптам яе, быццам стрэл, разрывае каманда: «Узво-о-о-д! У атаку! Наперад!» На брустверы паяўляюцца фігуркі байцоў. Хуткасць, манеўр — гэта тое, што часта вырашае поспех бою.

...Траншэя ўжо ў двух-трох дзесятках метраў ззаду. Усё! Больш бегчы нельга, трэба падаць і адпаўзаць на метры два ўбок, інакш будзеш знішчан агнём «праціўніка». Так вучыць тактыка бою. Так гаварыў маёр Кавалёў. І рабяты старанна выконваюць гэтае нялёгкае правіла. Павольна, але настойліва ланцуг пасоўваецца да вышыні. Чым бліжэй гэты ўзгорак, тым часцей прыпадаюць хлопцы да палінялай травы. Тут ужо выручае кулямётчык Лёня Садлуцкі, надзейна прыкрываючы ўзвод з правага фланга. Апошні адчайны кідок — і вышыня ўзята! Пастаўленую задачу ўзвод паспяхова выканаў...

Ваенная кафедра БДУ імя У. І. Леніна лічыцца адной з лепшых у сістэме навучальных устаноў краіны. Выпускнікі кафедры па ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі не ўступаюць афіцэрам, якія закончылі ваенныя вучылішчы. Нярэдка ва універсітэт прыходзяць пісьмы з падзякамі з месц, дзе служаць выпускнікі кафедры.

...Над мірным полем зноў гучыць ваенная каманда: «Узво-о-о-д! У атаку! Наперад!» Хлопцы вядуць вучэбны бой. Яны ведаюць: ён неабходны для таго, каб і поле, і неба наша заўсёды былі мірнымі.

В. АЛЯШКЕВІЧ,
студэнт III курса журфака.
Фота А. Басава.

НА ПАДОЛЬСКІМ ПАМОСЦЕ

Падмаскоўны горад Падольск сабраў на спаборніцтвы мацнейшых штангістаў з 41 вышэйшай навучальнай установы. Нашу рэспубліку прадстаўлялі дзве каманды: каманда інстытута фізічнай культуры і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Па ўмовах спаборніцтва кожная з каманд павінна складацца з 7 чалавек.

Як ніколі моцнай на гэтым першынстве была каманда нашага універсітэта. У састаў яе ўваходзілі чэмпіён Беларусі 1977 г., член зборнай каманды рэспублікі, майстар спорту Мікалай Бутавец, бронзавы прызёр першынства Беларусі гэтага года, член зборнай рэспублікі, майстар спорту Алег Гусеў, а таксама майстры спорту Дзмітрый Петухоў, Аляксандр Дзергачоў, Уладзімір Фралоў, Аляксандр Кавалеўскі і кандыдат у майстры спорту Мікалай Ліхадзед.

У выніку трохдзённай барацьбы на цяжкаатлетычным памосце зборная БДУ заняла агульнакаманднае другое месца. Чэмпіёнамі гэтага першынства сталі студэнты Маскоўскага энергетычнага інстытута. Цяжкаатлеты Беларускага інстытута фізічнай культуры занялі чацвёртае месца.

Трэба асабліва адзначыць выступленне члена каманды БДУ Дзмітрыя Петухова. Ён выступаў у лёгкай вагавой катэгорыі (да 62 кг). У асабістым заліку з вынікам 274 кг у суме двух практыкаванняў ён заняў другое месца. У рыўку Дзмітрый паказаў вынік 122 кг. Ён таксама быў блізкі да поспеху ў барацьбе са штангай вагой у 131 кг — гэта на адзін кг вышэй рэкорду таварыства «Буравеснік». Але на гэты раз рэкордная штанга не пакарылася атлету. У другім практыкаванні — штуршку Д. Петухоў паказаў вынік у 152 кг. Набраная ім сума ў двухборстве на 15 кг вышэй нарматыву майстра спорту.

Ніжэй сваіх магчымасцей выступіў Мікалай Бутавец. У асабістым заліку ён заняў чацвёртае месца. Не лепшыя свае вынікі паказаў і Уладзімір Фралоў, які выступаў у першай цяжкай вазе. Ён у асабістым заліку быў толькі пятым. Астатнія члены каманды выступілі ў меру сваіх сіл.

Падзяліцца меркаваннямі аб выступленні штангістаў БДУ мы папрасілі трэнера каманды, майстра спорту Віктара Фёдаравіча Кавалёва.

— У цэлым вынікамі гэтых спаборніцтваў я задаволен, — сказаў ён. — Асабліва парадаваў сваімі выступленнямі Дзмітрый Петухоў. Шчыра кажучы, мы не спадзяваліся, што ён зойме другое месца.

Нізкія для сябе вынікі паказалі Мікалай Бутавец і Уладзімір Фралоў. Выступі яны крыху лепш, і мы маглі б заняць першае агульнакаманднае месца. У мінулым годзе мы занялі на такіх спаборніцтвах 6-е месца, зараз другое. Я лічу, што гэта ўжо поспех.

Не развітваемся з футболам

Закончылася першынство Мінскага аблсавета таварыства «Буравеснік» па футболу. У ім прынялі ўдзел каманды ўсіх ВНУ г. Мінска. Гульні праходзілі па кругавой сістэме. Першы круг адбыўся вясной, другі — восенню. У выніку ўпартай барацьбы першае месца заняла каманда нашага універсітэта. Поспех каманды па праву можа раздзяліць і яе трэнер — старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Віталій Фёдаравіч Іштван.

Перамога нашай каманды абумоўлена высокай фізічнай і тэхнічнай падрыхтоўкай футбалістаў. Роўна і на высокім узроўні, на думку трэнера, правялі ўсе гульні першынства вядучыя ігракі каманды. Уладзімір Гамеза (хімфак), Сяргей Гняўко (ФПМ), Віктар Блізнюк (малодшы навуковы супрацоўнік НДІ), Аляксандр Барысевіч (журфак) — гэтыя футбалісты з'яўляюцца кандыдатамі і членамі зборнай каманды Белсавета таварыства «Буравеснік».

Летні сезон закончыўся, але мы не развітваемся з футболам. У зімовы час будуць праведзены розныя турніры па міні-футболу. Першы такі турнір на прыз лётчыка-касманаўта П. Клімука адбудзецца ў час зімовых канікул. У ім прымуць удзел каманды ВНУ г. Мінска, некаторыя каманды вытворчых калектываў і спецыялізаваных ДЮСШ. У цяперашні час каманда БДУ ўзмоцнена рыхтуецца да гэтага адказнага турніру.

Алімпійская грашова-рэчавая

На рэкламных шчытах горада Мінска зноў паявіліся маляўнічыя афішы, паведамляючыя аб продажы чарговай серыі алімпійскай грашова-рэчавай латарэі «Спрынт», якая заваявала вялікую папулярнасць сярод мінчан і гасцей сталіцы.

Білеты гэтай латарэі разыходзяцца сапраўды ў спрынтэрскім тэмпе, і вельмі многія становяцца ўладальнікамі каштоўных выйгрышаў.

Палова сродкаў латарэй ідзе на арганізацыю Алімпіяды-80, будаўніцтва і рэканструкцыю алімпійскіх збудаванняў.

Білеты «Спрынт» прадаюцца серыямі. Серыя складаецца з 2.000.000 білетаў на суму 1.000.000 рублёў. Кошт аднаго білета — 50 кап. Набыўшы і ўскрыўшы яго, вы адразу ж бачыце, ці выйграў ён.

Білет складаецца з дзвюх частак — канверціка і выйгрышнага білета. Тэхналогія іх вырабу выключае любую магчымасць «зазірнуць» у білет. Аперацыі па друкаванню канвертаў і білетаў выконваюцца механізавана на спецпрадпрыемствах. Аўтаматы апламбіруюць гатовую прадукцыю і фасуюць у скрынкі па 200 штук. Такі падыход гарантуе поўнае захаванне латарэйнага прынцыпу: нікому нічога невядома. Як павязе.

Сумарны размер выйгрышаў 500.000 рублёў. Яны складаюцца з 286.077 грашовых на суму 426.057 рублёў і 29 рэчавых выйгрышаў на суму 73.943 рублі. Мінімальны выйгрыш — права атрымаць бясплатна яшчэ адзін білет латарэі.

Грашовыя выйгрышы такія: 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100, 200, 500, 1000, 5000 рублёў. Апошні максімальны. Ён адзін. Сярод рэчавых выйгрышаў разыгрываюцца два «Масквічы 412-ІЭ», пяць аўтамашын «Жыгулі ВАЗ-2103» і «Жыгулі ВАЗ-21011», два «Запарожцы 968А», дзевятнаццаць матацыклаў марак «ІЖ-Юпітэр-3», «ІЖ-Планета-4», «Днепр-МТ-10», «М-67-Урал», «Усход-2», ММВЗ-3111». Галоўны рэчавы выйгрыш — аўтамашына «Волга ГАЗ-24».

Выйгрыш коштам да 25 рублёў можна атрымаць на месцы набыцця білета. Білеты з большымі выйгрышамі прад'яўляюцца для аплаты ў ашчадныя касы.

А ў цяперашні час, улічваючы, што прыняць удзел у латарэі жадаюць не толькі жыхары сталіцы і госці, а і многія аматары гэтай гульні з іншых населеных пунктаў, а таксама каб пазбегнуць вялікіх чэрг у месцах рэалізацыі, Беларускае рэспубліканскае ўпраўленне спартыўных латарэй арганізавала продаж білетаў па заяўках. Прадстаўнік любога прадпрыемства, установы можа атрымаць ва ўпраўленні за наяўны разлік нераскрытыя каробкі білетаў для сябе і сваіх таварышаў па працы, вучобе, спорту.

М. ЧЫКУН,
намеснік начальніка Беларускага рэспубліканскага ўпраўлення «Спортлато».

НА ПЕРШЫНСТВО УНІВЕРСІТЭТА

Спартыўная зала юрыдычнага факультэта перапоўнена. Праз дзесяць хвілін тут пачнуцца спаборніцтвы на першынство універсітэта па вольнай барацьбе.

З уступным словам выступае галоўны суддзя спаборніцтваў, майстар спорту Уладзімір Мікалаевіч Лятун:

— Штогод кафедра фізічнага выхавання і спорту праводзіць спартыўныя спаборніцтвы з мэтай вызначыць лепшую каманду універсітэта.

Сёння выступаюць 90 спартсменаў ад васьмі факультэтаў універсітэта. Радасна адзначыць, што сярод іх майстар спорту В. Асмалоўскі (хімфак) і шэсць кандыдатаў у майстры спорту: В. Азарэвіч, В. Гурленя, В. Радзькоў, І. Рудзянкоў, В. Куклін, В. Унгур. У каляктыў барцоў улілася вялікая колькасць першакурснікаў, якія ўпершыню выступаюць за гонар свайго факультэта.

На дыван выйшла першая пара спартсменаў вагавой катэгорыі 48 кг. Пачалася ўпартая і цяжкая барацьба.

Асабліва цікава ідзе барацьба кандыдатаў у майстры спорту В. Унгура і В. Гурэні. Абодва спартсмены моцныя, па-майстэрску валодаюць прыёмамі сучаснай барацьбы. І толькі на апошніх секундах пасля ўмелага прымянення прыёму выйграў па ачках В. Гурэня.

Хочацца адзначыць добрае выступленне маладога барца, першакурсніка Ю. Лыпко. Нягледзячы на тое, што ён выступаў упершыню ў турніры такога рангу, яму ўдалося атрымаць перамогу над двума кандыдатамі ў майстры спорту і ў выніку стаць чэмпіёнам у вагавой катэгорыі 62 кг.

Слаба выступілі барцы факультэта журналістыкі. Гэта атрымалася ў выніку таго, што ўдзельнікі каманды несур'ёзна аднесліся да гэтага спартыўнага мерапрыемства.

У выніку ў вагавой катэгорыі 48 кг першае месца заняў Б. Дзягцяр (мехмат), у вагавой катэгорыі 52 кг — Е. Давыдоўскі (фізфак), у вагавой катэгорыі 68 кг — А. Садоўскі (біяфак), у вагавой катэгорыі 74 кг — В. Гурленя (фізфак), у вагавой катэгорыі 82 кг — В. Асмалоўскі (хімфак), у вагавой катэгорыі 90 кг — І. Рудзянкоў (гістфак), да 100 кг — В. Гольдберг (фізфак), звыш 100 кг — В. Яскевіч (юрфак).

Моцнымі былі каманды фізічнага, юрыдычнага, механіка-матэматычнага факультэтаў.

Першае месца (204 ачкі) заняў фізічны факультэт, другое — юрыдычны (180 ачоў), трэцяе — механіка-матэматычны (160 ачкоў).

Чацвёртае — хімічны факультэт (100 ачкоў), пятае — гістарычны (92 ачкі), шостае — біялагічны (74 ачкі), сёмае — ФПМ (74 ачкі), на апошнім месцы факультэт журналістыкі.

Пасля падвядзення вынікаў спаборніцтва чэмпіёнам вагавых катэгорый былі ўручаны граматы спартыўнага клуба БДУ.

У суботу ў актавай зале універсітэта адбыўся спартыўны вечар. На ім былі падведзены вынікі XXV спартакіяды універсітэта і агляду-конкурсу па спартыўна-масавай рабоце за 1976-77 навучальны год.

У сваім выступленні старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. Ф. Кавалёў адзначыў, што ў XXV спартакіядзе універсітэта прынялі ўдзел 5 тысяч студэнтаў. У сучасны момант ва універсітэце 85 працэнтаў студэнтаў — значкісты ГПА, 250 чалавек здалі нормы на «Залаты значок», 76 спартсменаў уваходзяць у зборную Белсавета «Буравеснік», 18 з'яўляюцца членамі зборных каманд Беларусі, 3 — Савецкага Саюза.

Першае месца ў агульнакамандным заліку заваявалі студэнты фізічнага факультэта. Ім і быў уручан пераходны Чырвоны сцяг. Другое прызавое месца заняў гістарычны факультэт і на трэцім — механіка-матэматычны.

Лепшыя спартсмены універсітэта былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі, вымпеламі, каштоўнымі падарункамі.

А. ВЕРУШ.

НА ЗДЫМКАХ: прыемна атрымліваць узнагароды; выступае чэмпіёнка СССР па скачках у вышыню **Т. БОЙКА**; намеснік сакратара парткома БДУ **У. А. НАВУМОВІЧ** уручае Ганаровую грамату студэнту фізфака **Я. КРУЦІКАВУ.**

Фота **В. Патапенкі.**

Спартыўную старонку падрыхтавалі студэнты II курса факультэта журналістыкі **А. Вырвіч, А. Ліпскі.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

220080, Мінск-80. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14.

Тэлефон 22-07-19.

АТ 21152 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1875.